КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_______________ А.І.Жук
«_2_» ___05___ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-1-81/2024/вуч.

**СУЧАСНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА**

**Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:
1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура
1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура.
Замежная мова (з указаннем мовы)**

2024 г.

Сканировано с CamScanner

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021, (20.04.2022, №85), АСВА 1-02 03 03-2021, (20.04.2022, №85), вучэбных планаў спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура (15.07.2021, №048 – 2021/у; 23.06.2022, №133 – 2022/у); 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) (15.07.2021, №050 – 2021/у; 23.06.2022, №134 – 2022/у); 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) (15.07.2021, №051 – 2021/у; 23.06.2022, №135 – 2022/у)

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

С.М.Тычына, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук;
Н.У.Чайка, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» М.Ф.Кавалеўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 от 25.03.2024 г.)

Загадчык кафедры ____________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 7 ад 7.05 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

Сканировано с CamScanner

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сучаснае літаратуразнаўства» працягвае і завяршае навучанне па адной з базавых дысцыплін, па якіх вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў-філолагаў у вышэйшай педагагічнай установе, – літаратуразнаўству. Яна знаёміць з найбольш агульнымі заканамернасцямі развіцця мастацтва слова: раскрывае змест асноўных эстэтычных і ўласна літаратурных катэгорый і паняццяў, неабходных для аналізу літаратурна-мастацкіх з’яў, характарызуе канцэпцыі і тэорыі сутнасці мастацкай творчасці, паказвае суадносіны літаратуры з рэчаіснасцю, выяўляе законы мастацкай творчасці, што служыць больш поўнаму раскрыццю і асэнсаванню мастацкага свету твора і творцы.

***Мэта вучэбнай дысцыпліны*** – фарміраванне ўяўлення аб актуальных тэндэнцыях развіцця сучаснага літаратуразнаўства ў Беларусі, Расіі і свеце.

***Задачы вучэбнай дысцыпліны*:**

– фарміраванне ўяўлення аб актуальных пытаннях сучаснага літаратуразнаўства;

– агляд актуальных праблем, розных падыходаў да вывучэння тэксту, традыцыйных метадаў і новых гіпотэз, прыёмаў аналізу мастацкай літаратуры;

– знаёмства з метадалогіяй і стратэгіяй сучаснага літаратуразнаўства, выпрацоўка навыкаў практычнага выкарыстання атрыманых ведаў у навукова-даследчай і прыкладной сферах дзейнасці;

– паглыбленне паняццяў пра асноўныя метады аналізу тэксту, метадалагічныя прыёмы і інструментарыі, валоданне якімі створыць умовы для паспяховай прафесійнай працы;

– раскрыццё сутнасці і ролі тэарэтычных ведаў пры вывучэнні літаратурных твораў розных гістарычна-мастацкіх эпох.

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.*** Згодна з вучэбнымі планамі для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура, 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) вучэбная дысцыпліна «Сучаснае літаратуразнаўства» ўваходзіць у кампанент установы адукацыі. Вучэбная дысцыпліна «Сучаснае літаратуразнаўства» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Гісторыя беларускай літаратуры 20–30-х гг. ХХ ст.», «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя», якія ўваходзяць у дзяржаўны кампанент, і абапіраецца на паняцці, атрыманыя падчас вывучэння вучэбных дысцыплін «Уводзіны ў літаратуразнаўства» і «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння».

***Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сучаснае літаратуразнаўства» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура спецыялізаванай кампетэнцыі СК-2: Здзяйсняць аналіз, сістэматызацыю і класіфікацыю базавых літаратуразнаўчых паняццяў і фактаў; у студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з

указаннем мовы) – спецыялізаванай кампетэнцыі СК-1: Здзяйсняць аналіз, сістэматызацыю і класіфікацыю базавых літаратуразнаўчых паняццяў і фактаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць***:

– прынцыпы і прыёмы літаратуразнаўчага аналізу мастацкіх тэкстаў;

– асноўныя рысы сучаснай навукі ў цэлым і літаратуразнаўства ў прыватнасці;

– актуальныя праблемы літаратуразнаўства;

– тэарэтычныя паняцці, звязаныя са спецыфікай сучаснай навукі;

– магчымасці і межы прымянення метадаў і прыёмаў аналізу найважнейшых сучасных літаратуразнаўчых школ.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***умець:***

– даваць вызначэнне асноўным літаратуразнаўчым тэрмінам і паняццям;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай, бібліяграфічнымі крыніцамі і сучаснымі пошукавымі сістэмамі ў ходзе асваення тэорыі і метадалогіі сучаснага літаратуразнаўства;

– выкарыстоўваць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы даследавання праблем літаратуразнаўства;

– арыентавацца ў разнастайнасці і супярэчлівасці эстэтычных школ, канцэпцый, дактрын, выпрацаваных філалагічнай думкай у канцы ХХ – пачатку ХХІ стст.;

– працаваць з тэарэтычнай, навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць:***

– літаратуразнаўчай тэрміналогіяй, здольнасцю кваліфікавана будаваць выказванне пра літаратуразнаўчыя з'вы;

– навыкамі абагульнення і сістэматызацыі вывучанага, вылучэння галоўнага, істотнага, бачання адметнага пры параўнанні розных літаратурных твораў;

– практычнымі навыкамі выкарыстання атрыманых ведаў у навукова-даследчай рабоце па літаратуразнаўству.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Сучаснае літаратуразнаўства» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

***Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца:*** праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія.

***Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.*** Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Сучаснае літаратуразнаўства» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна (кіруемая самастойная работа студэнтаў), напісанне рэфератаў, падрыхтоўка дакладаў для выступлення на студэнцкіх навуковых канферэнцыях і інш.

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы прамежкавай атэстацыі.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сучаснае літаратуразнаўства» на 4 курсе ў 7 семестры разлічана на 96 вучэбных гадзін. З іх 48 аўдыторных гадзін: 24 лекцыйных, 24 гадзіны практычных заняткаў. Форма атрымання адукацыі – дзённая, форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| **Семестр** | **Усяго** | **Лекцыі** | **Практычныя** | **Самастойная работа студэнтаў** | **Форма прамежкавай атэстацыі** |
|---|---|---|---|---|---|
| VII | 96 | 24 | 24 | 48 | Экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны

Літаратурная творчасць і падыходы да яе на сучасным этапе. Актуальныя праблемы літаратуразнаўства. Комплексны характар сучасных літаратуразнаўчых даследаванняў, інтэграцыя паэтыкі, стылістыкі, тэксталогіі, эстэтыкі, культуралогіі. Сучасныя тэхналогіі матыўнага аналізу. Існуючыя азначэнні. Роля крытычнага артыкула ў літаратуразнаўчым даследаванні. Сучасная інтэрпрэтацыя крытычнай спадчыны вядучых крытыкаў.

## Тэма 2. Літаратура і міф у сучасным літаратуразнаўстве

Паняцце міфа, неаміфа, міфалагемы, міфалагізацыі ў сучасным літаратуразнаўстве. Прыёмы міфалагізацыі. Дэміфалагізацыя і рэміфалагізацыя. Міфалагічная рэканструкцыя ў творчасці сучасных пісьменнікаў. Літаратура і духоўная культура. Хрысціянскі тып культуры і руская класічная літаратура. Спецыфіка ўспрымання і адлюстравання элементаў хрысціянскай культуры ў творчасці рускіх пісьменнікаў-класікаў. Кірунак «рэлігійнага літаратуразнаўства» (С.Г. Бачараў): pro et contra.

## Тэма 3. Літаратуразнаўчая біяграфія і формы каментавання мастацкага тэксту

Вызначэнне літаратуразнаўчай біяграфіі. Віды літаратуразнаўчых біяграфій. Каментарый, аналіз, эсэ як формы адлюстравання канцэпцыі крытыка-літаратуразнаўцы. Біяграфія пісьменнікаў як крыніца міфаспараджальных працэсаў.

## Тэма 4. Постмадэрнісцкая сітуацыя і постмадэрнізм. Спецыфіка постмадэрнізму

Тэарэтычныя асновы постмадэрнізму. Сімулятыўнасць рэчаіснасці. Свет як тэкст, метафара «смерць аўтара», татальны плюралізм. Спецыфіка рускага постмадэрнізму. Канцэпцыі постмадэрнізму ў работах айчынных літаратуразнаўцаў (М. Ліпавецкі, М. Эпштэйн, І. Скарапанава і інш.).

## Тэма 5. Класічныя і мадэрнісцкія літаратуразнаўчыя школы

Праблема ўзаемадзеяння класічных і некласічных мастацкіх сістэм у работах айчынных літаратуразнаўцаў (М. Ліпавецкі, Т. Маркава, Г. Нефагіна і інш.). Узаемадзеянне постмадэрнісцкіх і рамантычных, барочных інтэнцый у творчасці сучасных пісьменнікаў. Формы праявы двухсветавасці, скразныя матывы сну, гульні, адметнасць стылю і інш.

## Тэма 6. Сучасныя літаратуразнаўчыя школы

Назвы, асноўныя прадстаўнікі, час існавання, асноўныя палажэнні, моцныя і слабыя бакі літаратуразнаўчых школ: неаструктуралізм і матыўны аналіз; міфапаэтыка і неаміфапаэтыка; этымалагізацыя і археапаэтыка; інтэртэкстуальны падыход да тэксту; мікрасемантычны аналіз тэксту;

інтэрмедыяльны аналіз; генератыўная паэтыка; неафрэйдызм і дэканструкцыя; сучасны літаратуразнаўчы пазітывізм; неабіяграфічны метад.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «СУЧАСНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА»
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдытарных часоў | | Самастойная праца студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **СУЧАСНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА** | **24** | **24** | **48** | | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 1.1. | 1. Літаратурная творчасць і падыходы да яе на сучасным этапе.<br>2. Актуальныя праблемы літаратуразнаўства.<br>3. Комплексны характар сучасных літаратуразнаўчых даследаванняў, інтэграцыя паэтыкі, стылістыкі, тэксталогіі, эстэтыкі, культуралогіі. | 4 | | 4 | Табліца «Катэгорыі і тэрміны» | [1]<br>[2]<br>[3] | |
| 1.2. | 1. Сучасныя тэхналогіі матыўнага аналізу. Існуючыя азначэнні.<br>2. Роля крытычнага артыкула ў літаратуразнаўчым даследаванні.<br>3. Сучасная інтэрпрэтацыя крытычнай спадчыны вядучых крытыкаў. | | 4 | 4 | Тэксты першакрыніц | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[7]<br>[9] | Праверка канспекту першакрыніц |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Літаратура і міф у сучасным літаратуразнаўстве** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 2.1. | 1. Паняцце міфа, неаміфа, міфалагемы, міфалагізацыі ў сучасным літаратуразнаўстве.<br>2. Прыёмы міфалагізацыі.<br>3. Дэміфалагізацыя і рэміфалагізацыя.<br>4. Міфалагічная рэканструкцыя ў творчасці сучасных пісьменнікаў. Літаратура і духоўная культура. | 4 | | 4 | Табліца «Міф у літаратуры» | [1]<br>[2]<br>[3] | |
| 2.2. | 1. Хрысціянскі тып культуры і руская класічная літаратура.<br>2. Спецыфіка ўспрымання і адлюстравання элементаў хрысціянскай культуры ў творчасці рускіх пісьменнікаў-класікаў.<br>3. Кірунак «рэлігійнага літаратуразнаўства» (С.Г. Бачараў): pro et contra. | | 4 | 4 | Тэксты мастацкіх твораў для аналізу | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[6]<br>[12] | Выкананне пісьмовага задання па тэме. |
| **3.** | **Літаратуразнаўчая біяграфія і формы каментавання мастацкага тэксту** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 3.1. | 1. Азначэнне літаратуразнаўчай біяграфіі.<br>2. Віды літаратуразнаўчых біяграфій. | 4 | | 4 | Табліца «Біяграфіі пісьменнікаў XX ст.» | [1]<br>[2]<br>[3] | |
| 3.2. | 1. Каментарый, аналіз, эсэ як формы адлюстравання канцэпцыі крытыка-літаратуразнаўцы.<br>2. Біяграфія пісьменнікаў як крыніца міфаспараджальных працэсаў. | | 4 | 4 | Тэксты літаратуры нон-фікшн | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[7] | Вуснае апытанне, навуковая дыскусія. Рэйтынгавая кантрольная работа № 1. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4.** | **Постмадэрнісцкая сітуацыя і постмадэрнізм. Спецыфіка постмадэрнізму** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 4.1. | 1. Тэарэтычныя асновы постмадэрнізму. Сімулятыўнасць рэальнасці.<br>2. Свет як тэкст, метафара «смерці аўтара», татальны плюралізм. | 4 | | 4 | Табліца «Постмадэрнізм» | [1]<br>[2]<br>[3] | |
| 4.2. | 1. Спецыфіка постмадэрнізму.<br>2. Канцэпцыі постмадэрнізму ў работах айчынных літаратуразнаўцаў (М. Ліпавецкі, М. Эпштэйн, І. Скарапанава і інш.). | | 4 | 4 | Тэксты мастацкіх твораў для аналізу | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[5]<br>[8] | Навуковая дыскусія, тэставае заданне па тэме. |
| **5.** | **Класічныя і мадэрнісцкія літаратуразнаўчыя школы** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 5.1. | 1. Постмадэрнізм.<br>2. Праблема ўзаемадзеяння класічных і некласічных мастацкіх сістэм у работах айчынных літаратуразнаўцаў (М. Ліпавецкі, Т. Маркава, Г. Нефагіна і інш.). | 4 | | 4 | Табліца «Класічныя і мадэрнісцкія школы ў літаратуразнаўстве» | [1]<br>[2]<br>[3] | |
| 5.2. | 1. Узаемадзеянне постмадэрнісцкіх і рамантычных, барочных інтэнцый у творчасці сучасных пісьменнікаў.<br>2. Формы праявы двухсветавасці, скразныя матывы сну, гульні, адметнасць стылю і інш. | | 4 | 4 | Тексты для аналізу | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[7]<br>[10] | Вуснае апытанне, навуковая дыскусія, тэставае заданне па тэме. |
| **6.** | **Сучасныя літаратуразнаўчыя школы** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 6.1. | 1. Назвы, асноўныя прадстаўнікі школ.<br>2. Час існавання, асноўныя палажэнні.<br>3. Моцныя і слабыя бакі літаратуразнаўчых школ. | 4 | | 4 | Табліца «Сучасныя літаратуразнаўчыя школы» | [1]<br>[2]<br>[3] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6.2. | 1. Неаструктуралізм і матыўны аналіз.<br>2. Міфапаэтыка і неаміфапаэтыка.<br>3. Этымалагізацыя і археапаэтыка.<br>4. Інтэртэкстуальны падыход да тэксту; мікрасемантычны аналіз тэксту.<br>5. Інтэрмедыяльны аналіз.<br>6. Генератыўная паэтыка.<br>7. Неафрэйдызм і дэканструкцыя.<br>8. Сучасны літаратуразнаўчы пазітывізм.<br>9. Неабіяграфічны метад. | | 4 | 4 | Тэксты першакрыніц | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[7]<br>[8] | Вуснае апытанне, навуковая дыскусія. Рэйтынгавая кантрольная работа № 2. |
| | **Усяго ў VII семестры** | **24** | **24** | **48** | | | Экзамен |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Тэорыя літаратуры [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей: 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)» / склад.: І. М. Гоўзіч, А. І. Лугоўскі // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/132. – Дата доступу: 02.04.2024.

2. Уводзіны ў літаратуразнаўства [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей: 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад. А. І. Лугоўскі // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/2318. – Дата доступу: 02.04.2024.

3. Хомякова, О. Р. Теория литературы : учеб. пособие для студентов учреждений высш. пед. образования по филол. специальностям / О. Р. Хомякова. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2013. – 359 с.

**Дадатковая літаратура**

4. Гиршман, М. М. Литературное произведение: теория и практика анализа : учеб. пособие. – М. : Высш. шк., 1991. – 456 с.

5. Заманская, В. В. Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века. Диалоги на границах столетий : учеб. пособие / В. В. Заманская. – М. : ФЛИНТА, 2012. – 304 с.

6. Кайда, Л. Г. Композиционный анализ художественного текст : Теория. Методология. Алгоритмы обратной связи: учеб. Пособие / Л. Г. Кайда. – М. : ФЛИНТА, 2013. – 152 с.

7. Полякова, Л. В. Литературоведение : введение в научно-исследовательскую практику, проблематику и терминологию / Л. В. Полякова. – М. : ФЛИНТА, 2015. – 380 с.

8. Современное зарубежной литературоведение стран Западной Европы и США. Концепции, школы, термины : энц. справочник. – М. : Интарда – ИНИОН, 1996. – 320 с.

9. Тюпа, В. И. Анализ художественного текста : учеб. пособие для студ. филол. фак. высш. учеб. заведений / В. И. Тюпа. – М. : Изд центр «Академия», 2006. – 326 с.

10. Турышева, О. Н. Теория и методология зарубежного литературоведения : учеб. пособие для студентов вузов / О. Н. Турышева. – М. : Наука : Флинта, 2012. – 160 с.

11. Эсалнек, А. Я. Основы литературоведения: анализ художественного произведения : учеб. пособие / А. Я. Эсалнек. – М. : ФЛИНТА, 2012. – 112 с.

12. Хализев, В. Е. Теория литературы : учеб. для студентов учреждений высш. проф. образования / В. Е. Хализев. – 6-е изд., испр. и доп. – М. : Академия, 2013. – 432 с.

13. Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / В. І. Яцухна. – Гомель : Гомел. дзярж. ун-т, 2006. – 279 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Сучаснае літаратуразнаўства» вялікая ўвага надаецца арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, якая з’яўляецца важнай формай адукацыйнага працэсу і павінна стаць яго асновай. Гэта прадугледжвае арыентацыю на актыўныя метады авалодання ведамі, развіццё творчых здольнасцей студэнтаў, навучанне з улікам патрэбнасцей і магчымасцей кожнай асобнай асобы.

Асноўнымі задачамі самастойнай работы з’яўляюцца:

– замацаванне і паглыбленне ведаў і ўменняў, атрыманых на аўдыторных занятках;

– падрыхтоўка да заняткаў і да розных форм кантролю;

– аб’ектыўнае ацэньванне ўласных вучэбных дасягненняў для арганізацыі ўласнай пазнавальнай дзейнасці і яе карэкціроўкі;

– развіццё самастойнасці ў пошуку і набыцці ведаў і ўменняў, а таксама навыкаў самастойнай навукова-даследчай дзейнасці;

– фармаванне культуры разумовай працы, умення працаваць з вучэбнай, метадычнай і навуковай літаратурай, з інфармацыйнымі рэсурсамі;

– выкарыстанне мультымедыйных рэсурсаў і камп’ютарных тэхналогій для апрацоўкі, перадачы, сістэматызацыі інфармацыі, стварэння баз даных, прэзентацыі вынікаў пазнавальнай і практычнай дзейнасці.

Самастойная работа студэнтаў рэалізуецца як у працэсе аўдыторных заняткаў (на лекцыях і практычных занятках), так і на кансультацыях, пры выкананні індывідуальных заданняў і г.д. Формы самастойнай работы студэнтаў могуць быць разнастайныя:

– вывучэнне навуковых артыкулаў і манаграфій, канспектаванне і рэфераванне першакрыніц;

– падрыхтоўка дакладаў і напісанне рэфератаў па актуальных пытаннях літаратуразнаўства;

– выкананне і абарона праектаў;

– складанне апорных схем і табліц;

– распрацоўка дыдактычнага матэрыялу для лекцыйных і практычных заняткаў;

– падбор бібліяграфіі па тэме;

– выкананне індывідуальных заданняў, накіраваных на развіццё ў студэнтаў самастойнасці і літаратуразнаўчай кампетэнцыі;

– выкананне навучальных і кантрольных тэстаў і г.д.

Самастойная работа павінна праводзіцца ў аб'ёме, прадугледжаным вучэбным планам, мець сістэматычны і бесперапынны характар і паэтапна кантраляванца выкладчыкам.

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Уводзіны | 8 | Скласці апорны канспект, структураваць тэарэтычны матэрыял. | Апорны канспект, табліцы, схемы |
| 2. | Літаратура і міф у сучасным літаратуразнаўстве | 8 | Падрыхтаваць канспект першакрыніц па тэме. | Канспект першакрыніц |
| 3. | Літаратуразнаўчая біяграфія і формы каментавання мастацкага тэксту | 8 | Скласці апорны канспект, структураваць тэарэтычны матэрыял; падрыхтаваць рэфераты аб выдатных літаратуразнаўцах; падрыхтаваць канспект першакрыніц. | Апорны канспект, табліцы, схемы, рэферат, канспект першакрыніц |
| 4. | Постмадэрнісцкая сітуацыя і постмадэрнізм. Спецыфіка постмадэрнізму | 8 | Скласці апорны канспект; падрыхтаваць рэфераты аб выдатных літаратуразнаўцах; падрыхтаваць канспект першакрыніц. | Апорны канспект, табліцы, схемы,рэферат, канспект першакрыніц |
| 5. | Класічныя і мадэрнісцкія літаратуразнаўчыя школы | 8 | Падрыхтаваць прэзентацыю ці інтэрактыўную лекцыю «Класічныя і мадэрнісцкія літаратуразнаўчыя школы». | Прэзентацыя (інтэрактыўная лекцыя) |
| 6. | Сучасныя літаратуразнаўчыя школы | 8 | Падрыхтаваць прэзентацыю або інтэрактыўную лекцыю «Сучасныя літаратуразнаўчыя школы»; падабраць бібліяграфію па тэме, уключыць у спіс найноўшыя даследаванні. | Прэзентацыя (інтэрактыўная лекцыя), бібліяграфічны спіс |
| | **УСЯГО** | **48** | | |

# ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ

Дыягностыка вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца абавязковым элементам адукацыйнага працэсу і ўяўляе сабой сукупнасць прыёмаў кантролю і ацэнкі, накіраваных на вырашэнне задач вучэбнай дысцыпліны і фарміраванне адпаведных кампетэнцый.

Асноўныя мэты дыягностыкі: аптымізаваць працэс навучання; вызначыць вынікі дзейнасці ўдзельніка педагагічнага працэсу і якасць адукацыі; звесці да мінімуму памылкі, якія могуць быць дапушчаны ў працэсе навучання; скарэкціраваць пры неабходнасці вучэбную дзейнасць студэнта.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Сучаснае літаратуразнаўства» рэкамендуюцца такія сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці, як:

– самастойная работа, якая дазваляе аб'ектыўна ацаніць веды, уменне і навыкі студэнтаў, вызначыць ступень засваення пэўных тэм і раздзелаў вывучаемай дысцыпліны;

– вуснае апытанне, якое прадугледжвае прэзентацыю студэнтамі вывучанага матэрыялу і дазваляе вызначыць, наколькі дакладна і дарэчна студэнты выкарыстоўваюць тэрміналагічны апарат дысцыпліны, валодаюць агульнымі паняццямі літаратуразнаўства;

– камбінаванае апытанне, якое дазваляе вызначыць узровень ведаў некалькіх студэнтаў адначасова;

– навуковая дыскусія, падчас якой студэнт дэманструе глыбіню валодання пытаннем;

– абмеркаванне і ўзаемаацэньванне студэнтамі вынікаў выканання заданняў для самастойнай работы;

– тэсціраванне па асобных раздзелах праграмы або па ўсім вучэбным матэрыяле, якое дае магчымасць хутка і аператыўна праверыць веды студэнтаў, у тым ліку ў дыстанцыйнай форме;

– калёквіум, які дазваляе ацаніць бягучы ўзровень ведаў студэнтаў па пэўным раздзеле дысцыпліны.

Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Літаратуразнаўства як навука. Узнікненне навукі аб літаратуры. Прадмет, аб’ект, задачы літаратуразнаўства.
2. Літаратурны працэс: шырокае і вузкае разуменне. Асноўныя тэрміны і паняцці.
3. Асноўныя катэгорыі, паняцці, тэрміны літаратуразнаўства.
4. Галоўныя галіны літаратуразнаўства, іх прадмет і задачы.
5. Унутраныя фактары развіцця літаратурнага працэсу (адштурхоўванне, парадзіраванне, стылізацыя, эпігонства).
6. Літаратура як від мастацтва. Месца літаратуры сярод іншых мастацтваў.
7. Унутраныя фактары развіцця літаратурнага працэсу (запазычванне, наследаванне, варыяцыя).
8. Унутраныя фактары развіцця літаратурнага працэсу (алюзія, рэмінісцэнцыя, цытаванне).
9. Мастацкі вобраз: шырокае і вузкае разуменне тэрміна. Характар. Тып.
10. Традыцыя і наватарства як фактары развіцця літаратуры.
11. Тэорыя стадыяльнасці. Перыядызацыя сусветнай літаратуры. Заканамернасці слоўнага мастацтва.
12. Паняцце пра паэтыку, яе віды.
13. Асаблівасці развіцця мастацкага слова Ранняга Сярэднявечча.
14. Эпоха Рэнесансу: сутнасць назвы, перыядызацыя, светапоглядная сістэма, набыткі і страты.
15. Барока як літаратурны напрамак.
16. Класіцызм як літаратурны напрамак: эстэтычныя прынцыпы, прадстаўнікі.
17. Сентыменталізм як літаратурны напрамак.
18. Філасофская аснова, творчыя прынцыпы мастацтва рамантызму.
19. Творчыя прынцыпы рэалізму. Тыпы рэалізму XIX–XX стагоддзяў. Класікі рэалістычнай літаратуры.
20. Мадэрнізм як мастацкая сістэма. Агульная характарыстыка.
21. Мадэрнісцкія кірункі і плыні (імпрэсіянізм, сімвалізм, акмеізм, імажынізм, экспрэсіянізм, экзістэнцыялізм і інш., характарыстыка на выбар.
22. Постмадэрнізм: агульная характарыстыка. Постмадэрнісцкія жанры.
23. Метадалогія літаратуразнаўства. Метады вывучэння літаратуры. Біяграфічны метад. Вызначальныя адзнакі (паводле Ш. Сент-Бёва).
24. Культурна-гістарычны метад (школа). Філасофская аснова (пазітывізм). Прынцыпы («три первоначальные силы, три различных источника» І. Тэна).
25. Псіхалагічны кірунак. Псіхааналіз у літаратуразнаўстве. Параўнальна-гістарычны метад. Кампаратывізм.
26. Фармальны метад. Сацыялагічны метад. Вульгарны сацыялагізм.
27. Іерархія ў літаратуры. Літаратурная класіка.

28. Канцэптуальны ўзровень літаратурнага твора. Тэматыка, праблематыка, ідэя, пафас.

29. Змест і форма як філасофска-эстэтычныя, літаратуразнаўчыя катэгорыі. Адзінства зместу формы.

30. Узровень знешняй формы мастацкага твора. Мова мастацкай літаратуры.

31. Мастацкі свет літаратурнага твора (узровень «унутранай формы») і яго структура.

32. Стыль у літаратуры.

33. Дайце азначэнне і прывядзіце прыклады літаратуразнаўчых паняццяў тэкст, кантэкст, метатэкст, аўтар, формы апавядання ў мастацкім творы.

34. Дайце азначэнне і прывядзіце прыклады літаратуразнаўчых паняццяў знак і сімвал (падабенства і адрозненне), мастацкі і немастацкі тэкст, жанр, сюжэт, фабула, персанаж літаратурнага твора, матыў.

35. Вызначце адметнасць і розніцу паняццяў літаратурны міф і аміф у літаратуры.

36. Дайце азначэнне метаду дэканструкцыі. Назавіце прыхільнікаў гэтага метаду ў Расіі і за мяжой.

37. Раскрыйце сэнс тэрмінаў «уплыў» і «запазычанне». Дайце вызначэнне ўнутраных (творчых) і знешніх сувязей. Назавіце формы праяўлення кантактных сувязей.

38. Вызначце ролю інтэртэкстуальнасці ў літаратуры постмадэрнізму.

39. Раскрыйце тэорыю В.М. Жырмунскага аб гісторыка-тыпалагічных сыходжаннях і пакажыце значэнне тыпалагічных даследаванняў для ўстанаўлення падобных тыпаў мастацкай свядомасці і храналагічнай дыферэнцыяцыі сусветнага літаратурнага працэсу.

40. Назавіце асноўныя віды тыпалагічных сыходжанняў, дайце іх вызначэнне і прывядзіце прыклады.

41. Вызначыце ўздзеянне на літаратурны працэс іншамоўнай літаратуры перакладу і арыгінала.

42. Пералічыце суб’ектыўныя і аб’ектыўныя фактары, якія ўплываюць на дакладнасць перакладу. Мастацкі пераклад і літаратурны працэс XX ст.

43. Раскрыйце палажэнні параўнальнага літаратуразнаўства ў працах В.М. Жырмунскага і М.П. Аляксеева.

44. Прааналізуйце метадалогію вывучэння ўспрымання рускай літаратуры за мяжой.

45. Выкажыце аргументы розных бакоў-удзельнікаў дыскусіі «Узаемасувязі і ўзаемадзеянне нацыянальных літаратур» і яе значэнне для далейшага развіцця параўнальнага літаратуразнаўства.

46. Дайце вызначэнне паняцця «параўнальнае літаратуразнаўства» (кампаратывістыкі ) за мяжой.

# ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА-АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ

1. Якое месца займае літаратура ў шэрагу іншых сфер культуры? Ці існуе, на ваш погляд, праблема ўзаемаўплыву «Літаратура і інтэрнэт»? Што такое «сецература»?

2. Ахарактарызуйце прапанаваныя літаратуразнаўчых школ па плане (назва, асноўныя прадстаўнікі, час існавання, асноўныя палажэнні, моцныя і слабыя бакі):

неаструктуралізм і матыўны аналіз.

3. Правядзіце аналіз прапанаваных літаратуразнаўчых школ па плане (назва, асноўныя прадстаўнікі, час існавання, асноўныя палажэнні, моцныя і слабыя бакі):

міфапаэтыка і неаміфапаэтыка.

4. Ахарактарызуйце прапанаваныя літаратуразнаўчыя школы па плане (назва, асноўныя прадстаўнікі, час існавання, асноўныя палажэнні, моцныя і слабыя бакі):

інтэртэкстуальны падыход да тэксту, мікрасемантычны аналіз тэксту.

5. Прааналізуйце прапанаваныя літаратуразнаўчыя школы (па плане (назва, асноўныя прадстаўнікі, час існавання, асноўныя палажэнні, моцныя і слабыя бакі):

неафрэйдызм і дэканструкцыя.

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***10 (дзесяць) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***9 (дзевяць) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***8 (восем) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***7 (сем) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***6 (шэсць) балаў, залічана:***

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***5 (пяць) балаў, залічана:***

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

***4 (чатыры) балы, залічана:***

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

***3 (тры) балы, не залічана:***

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

***2 (два) балы, не залічана:***

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

***1 (адзін) бал, не залічана:***

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

по вывучаемай дысцыпліне
з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай рабочай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 1 абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Уводзінах у літаратуразнаўства» | 25.03.2024 Пратакол № 8 |
| «Гісторыя беларускай літаратуры 20–30-х гг. ХХ ст.» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 3 выкарыстоўваць тэксты пісьменнікаў першай трэці ХХ ст. | 25.03.2024 Пратакол № 8 |
| «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 5 выкарыстоўваць тэксты пісьменнікаў пачатку ХХ ст. | 25.03.2024 Пратакол № 8 |
| «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 2 абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» | 25.03.2024 Пратакол № 8 |